# ЗАЙМЕННІК У ПОМНІКАХ ПАЛІТЫЧНАЙ САТЫРЫ XVI – XVII ст.

**Раднянкова А.В.**

Займеннік з'яўляецца сваеасаблівай часцінай мовы, якая ўказвае на прадметы, прыметы ці колькасць, але не называе іх.

Займеннікаў у мове нямнога, але ўжываюцца яны часта – замяняюць раней названыя назоўнікі, прыметнікі, лічэбнікі, дапамагаюць пазбегнуць паўтору тых самых слоў. Займеннікі маюць шырокае абагульняльнае значэнне, якое канкрэтызуецца, становіцца зразумелым толькі ў кантэксце:

*Колькі жъ до тебе паничыкъ прыдде, частуй же іего достаткомъ, да и жонку свою подлд іего посады*...[1, с.317].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Па сваіх марфалагічных адзнаках і сінтаксічных функцыях займеннікі ў старажытны перыяд, як і ў сучаснай беларускай мове, падзяляюцца на дзве групы: асабовыя і неасабовыя [2, с.119].

**Формы асабовых займеннікаў.** У „Прамове Мялешка" і „Лісце да Абуховіча" мы можам сустрэць займеннікі першай і другой асобы. Першая асоба адзіночнага ліку выражаецца пры дапамозе займенніка я: *а я на гетакихъ зъѢздахъ няколи не бывалъ...* [ ,с.316]. Старажытнарускі займеннік язь і старaславянскі азъ у гэтых помніках ўжо не адлюстраваныя.

Адзінай у старабеларускай пісьменнасці, як і ў старажытнарускай, з'яўляецца форма назоўнага склону займенніка другой асобы адзіночнага ліку ты, якую мы можам таксама сустрэць у тэкстах:

*ты пане за столъ, а слуга собѣ за столъ; ты борщикъ, а слуга за пукатую штуку мяса...[1, с.317].*

Старажытнаруская мова з'явілася для старабеларускай непасрэднай крыніцай двухскладовай формы роднага і вінавальнага склонаў асабовых займеннікаў:

*Jost u mene starye knihi...[1, с.440].*

*Nie hniewajsie, twoja, milos't na mene...[1, с.440].*

Акрамя формы мене, у „Прамове Мялешка" адзначаем і форму меня (родны склон адзіночны лік): *и на меня ласкавыя паны братія* [1, с.316].

Прычыны з'яўлення канчатка -а вучоныя тлумачать па–рознаму: А.А.Шахматаў і М.М.Дурнаво лічаць пераўтварэнне е□я вынікам фанетычнага змянення. А.І.Сабалеўскі тлумачыць гэта марфалагічнымі зменамі: уздзеяннем на займеннік форм роднага склону адзіночнага ліку назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду скланення на -о; -jo. У.В.Ягіч бачыць тут уплыў форм вінавальнага склону адзіночнага ліку займеннікаў МЯ( ), ТЯ( ), СЯ( ). Т.Ф.Сцяшковіч зазначае, што пераканальнымі з'яўляюцца два апошнія тлумачэнні. У карысць збліжэння форм займеннікаў з формамі скланення назоўнікаў з асновай на -о; -jo гаворыць і той факт, што ў старажытнасці пераважная большасць назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду абазначалі асоб [4, с.17].

Нязменным захаваннем старажытных форм характарызуецца давальны склон адзіночнага ліку. У параўнанні са старажытнарускай мовай некалькі змянілася толькі фанетычнае выражэнне гэтых форм: мьнѣ □ мнѣ □ мне. Праўда, у помніках палітычнай сатыры канчатак -Ѣ захоўваецца паралельна з -е, што тлумачыцца не асаблівасцю яго вымаўлення, а пісьмовай традыцыяй:

*Пришло менѣ зъ вами радыты...[1, с.316];*

*...годынникъ мнѣ притрафилося купиты...[1, с.318];*

*czuw od kodos' y to mne zwiestiw...[1, с.441].*

Парадыгма асабовых займеннікаў множнага ліку ў старабеларускай пісьменнасці ў параўнанні са старажытнарускай істотных змен не адчула, за выключэннем амаль поўнай страты іменнымі формамі і формамі парнага ліку сваёй граматычнай ролі [3, с.146].

Засяродзім увагу на ўжыванні ў помніках палітычнай сатыры множнага ліку. Так, у назоўным склоне адзінымі з'яўляюцца ранейшыя формы мы,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**вы**: *A szto my, durnyie, w kożuchach... dobywali, to y, mudrye, w sobolach [1, c.440].*

У родным склоне маюць месца формы **насъ**, **васъ**: *i ost tam komu wa□ sypaty y bez nas [1, c.440]; НЂмцевъ якъ насъ улюбили [1, c.316];*

у давальным склоне – **намъ**, **вамъ**: *Чтобы къ вамъ здоровъ прідхалъ ... [1, c.316]; a bezmal nam toie nie minietsie [1, c.440];*

у творным склоне – **нами**, **вами**: *Пришло менд зъ вами радыты* [1, с.316].

Формы займеннікаў, ужытыя ў помніках палітычнай сатыры, у далейшым пашыраюцца і замацоўваюцца ў беларускай мове. Яны ўваходзяць у літаратурную мову як агульнапрынятыя нормы і пашыраюцца у мясцовых дыялектах. Своеасаблівай устойлівасцю граматычных форм вызначаюцца асабовыя займеннікі, бо сучасныя формы адрозніваюцца ад старажытных толькі фанетычным выражэннем.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Літаратура:

1. Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы. Мн.: выд – ва АН БССР, 1961.

2. Нарысы па гісторыі беларускай мовы. Мн.: вучэбна – педагагічнае выд – ва міністэрства асветы БССР, 1957.

3. Мова беларускай пісьменнасці XIV – XVIII ст. Мн.: Навука і тэхніка, 1988.

4. Сцяшковіч Т.Ф. Займеннік у беларускай мове. Мн.: Навука і тэхніка, 1977.